Памятная капсула закладываецца ў азнаменаванне
пачатку будаўніцтва

**ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНАГА ЖЫЛОГА ДОМА,**

які з'яўляецца часткай сумеснага праекта Дэпартамента
па энергаэфектыўнасці Дзяржстандарта, г. Мінска, Праграмы развіцця ААН
і Глабальнага экалагічнага фонда

г. Мінск
12 студзеня 2016 г.

***

Памятная капсула закладывается в ознаменование
начала строительства

**ЭНЕРГОЭФФЕКТИВНОГО ЖИЛОГО ДОМА,**

который является частью совместного проекта Департамента
по энергоэффективности Госстандарта, г. Минска, Программы Развития ООН
и Глобального Экологического Фонда

г. Минск
12 января 2016 г.

***

This capsule was put to commemorate
the beginning of the construction of

**ENERGY EFFICIENT RESIDENTIAL HOUSE,**

which is a part of the joint project of the Department for Energy Efficiency
of Gosstandart, city of Minsk, UN Development Programme
and Global Environment Facility

city of Minsk
January 12, 2016

Гэтая капсула закладзена 12 студзеня 2016 г. на пачатку будаўніцтва энергаэфектыўнага жылога дома ў рамках праекта "Павышэнне энергаэфектыўнасці жылых будынкаў у Рэспубліцы Беларусь". Праект рэалізуецца пры падтрымцы Глабальнага экалагічнага фонду (ГЭФ), Праграммы развіцця Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ПРААН) і Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь.

Мы спадзяёмся, што гэтая капсула будзе адкрытая ў 2067 годзе і вы прачытаеце гэтыя радкі, калі Мінск будзе святкаваць сваё тысячагоддзе. Мы спадзяемся, што жыхары Мінска, усёй Беларусі, а таксама людзі па ўсім свеце маюць роўны доступ да энергіі, цяпла, вады і іншых прыродных рэсурсаў, адукацыі і аховы здароўя. Мы маем надзею, што голад, галеча і эпідэміі пераможаныя, што Аб'яднаныя Нацыі планеты навучыліся жыць у міры, вырашаць супярэчнасці і супрацоўнічаць. Менавіта да такой будучыні імкнуцца Аб'яднаныя Нацыі, рэалізуючы праграму “Мэты ўстойлівага развіцця”.

Што расказаць вам пра наш час? У 2015 годзе увесь свет адзначыў 70-годдзе ААН, а Рэспубліка Беларусь – 25-годдзе прыняцця Дэкларацыі аб суверэнітэце. У 2016 годзе мы адзначаем 50 год Праграме развіцця Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і 40 год будаўнічай арганізацыі “МАПІД”, якая збудавала цей будзінак. На сёння нашая цывілізацыя шмат чаго дасягнула – у нас амаль дастаткова ведаў і сілаў, каб забяспечыць годнае жыццё для ўсіх жыхароў планеты. Але свет не жыве ў спакоі, дастатку і шчасці. Шмат краін перажывае жорсткія эканамічныя, сацыяльныя і энергетычныя крызісы. Таму ўсё большую вастрыню набываюць пытанні экалогіі, ашчаднага падыходу да выкарыстання прыродных рэсурсаў, устойлівага развіцця, энергаэфектыўнасці і альтэрнатыўнай энергетыкі. Яшчэ не ўва ўсіх краінах звярнулі пільную ўвагу на гэтыя праблемы, але мы спадзяёмся, што яшчэ ёсць час і магчымасць павярнуць лёс планеты да лепшага.

Мы вельмі рады, што ў Беларусі таксама пачынаюць усур'ёз задумвацца пра тое, якую спадчыну мы пакінем вам, нашым нашчадкам. Наш праект мае мэтай распаўсюдзіць практычны вопыт энергаэфектыўнага будаўніцтва, паказаць прыклад больш разумнага падыходу да выкарыстання энергетычных рэсурсаў.

Мы спадзяемся, што гэты дом, будоўлю якога мы пачынаем зараз, стане цёплым і ўтульным родным для мноства шчаслівых сем'яў, што ў вашых кватэрах заўсёды будзе каханне, спакой і дастатак, што ў гэтым доме заўсёды будзе чуваць вясёлы дзіцячы смех. Спадзяёмся, што вы будзеце жыць у большай гармоніі з прыродай і зможаце зрабіць нашую планету яшчэ больш утульным домам.

З найлепшымі пажаданнямі!

Ад горада Мінска

Ад ПРААН

Ад Дэпартамента
па энергаэфектыўнасці

Ад МАПІД